programs (638 MB). – Los Angeles, 1992–1995. – 1 electronic optical disc (CD-ROM).
3. *Тацит Публий Корнелий.* Анналы / Тацит Публий Корнелий // Анналы. Малые произведения. История. – М., 2003. – С. 5–423.
4. *Тацит Публий Корнелий.* О происхождении и местах обитания германцев / Тацит Публий Корнелий // Анналы. Малые произведения. История. – М., 2003. – С. 458–483.
5. *Аммиан Марцеллин.* Римская история / Аммиан Марцеллин; пер. с лат. Ю.А. Кулаковского, А.И. Сонни. – М.: АСТ, 2005. – 631 с.
6. *Иордан.* О происхождении и деяниях гетов («Getica») / Иордан; вступ. ст., пер., коммент. Е.Ч. Скржинской. – М.: Издательство восточной литературы, 1960. – 436 с.
7. *Турский, Г.* История франков / Г. Турский; пер. с англ. С. Федорова. – М.: Центрполиграф, 2009. – 543 с.
8. *Вольфрам, Х.* Готы. От истоков до середины VI века / Х. Вольфрам; пер. с нем. Б.П. Миловидова, М.Ю. Некрасова. – СПб.: Ювента, 2003. – 656 с.
9. *Гимбутас, М.* Славяне. Сыны Перуна / М. Гимбутас; пер. с англ. Ф.С. Капицы. – М.: Центрполиграф, 2008. – 216 с.
10. *Корсунский, А.Р.* Упадок и гибель Западной Римской империи и возникновение германских королевств (до середины VI в.) / А.Р. Корсунский, Р. Гюнтер. – М.: Издательство МГУ, 1984. – 256 с.
11. *Мюссе, Л.* Варварские нашествия на Европу: германский натиск / Л. Мюссе; пер. с фр. А.П. Саниной. – СПб.: Евразия, 2006. – 416 с.
12. *Тодд, М.* Варвары. Древние германцы. Быт, религия, культура / М. Тодд; пер. с англ. Н.Ю. Чехонадской. – М.: Центрполиграф, 2005. – 223 с.
13. *Магомедов, Б.В.* Этнические компоненты черняховской культуры / Б.В. Магомедов // Stratum plus. – 2000. – № 4. – С. 322–330.
14. *Монгайт, А.Л.* Археология Западной Европы. Бронзовый и железный века / А.Л. Монгайт. – М.: Наука, 1974. – 408 с.
15. *Шкунаев, С.В.* Германские племена и союзы племен / С.В. Шкунаев // История Европы: в 8 т. / редкол.: З.В. Удальцова [и др.]. – М., 1988. – Т. 1: Древняя Европа / Е.С. Голубцова [и др.]. – С. 594–605.
16. *Гумилев, Л.Н.* История народа хунну. В 2 кн. / Л.Н. Гумилев. – М.: Институт ДИ-ДИК, 1998. – Кн. 2. – 496 с.
17. *Седов, В.В.* От истоков Вистулы / В.В. Седов // Родина. – 2001. – № 1. – С. 19–25.
18. *Буданова, В.П.* Варварский мир эпохи Великого переселения народов / В.П. Буданова. – М.: Наука, 2000. – 544 с.
19. *Буданова, В.П.* Готы в эпоху Великого переселения народов / В.П. Буданова. – СПб.: Алетейя, 1999. – 320 с.
20. *Щукин, М.Б.* Рождение славян / М.Б. Щукин // Stratum plus. – 1997. – № 1. – С. 110–147.
21. *Мядзведзеў, А.М.* Этнакультурная гісторыя насельніцтва Беларусі ў жалезным веку / А.М. Мядзведзеў // Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2000. – Т. 1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / В. Вяргей [і інш.]. – С. 99–106.
22. *Рассадзін, С.Я.* Землі амаль невядомыя. Будучая Беларусь паводле антычных манускрыптаў / С.Я. Рассадзін. – Мінск: Полымя, 1996. – 95 с.
23. *Тугай, В.В.* История средних веков: Древние германцы: учеб. пособие / В.В. Тугай. – Минск: БГПУ, 2006. – 173 с.

SUMMARY

*The article is devoted to the problems of the history of the German tribes as the active components of the barbarian periphery of Europe in I – IV centuries A.D. The author touches upon the peculiarities of the Germans' development in the context of the ethnocultural processes of the given region. The general features of the interaction between the Roman Empire and barbarous communities are considered. The topicality of the theme is caused by that the representatives of the given ethnos took part in the tribal area's transformation of the continent.*

Паступіў у рэдакцыю 02.02.2010 г.

*УДК 947.6«1591/1593»*

***У.М. Кадзіра,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, намеснік дэкана гістарычнага факультэта БДПУ*

# КАЗАЦКА-СЯЛЯНСКАЕ ПАЎСТАННЕ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ К. КАСІНСКАГА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ І УКРАІНЫ (1591–1593 гг.)

У сувязі з развіццём феадальна-прыгонніцкіх адносін у Беларусі і Украіне ў другой палове XVI – першай трэці XVII ст. класавая барацьба ў розных яе формах і сферах жыцця набывала ўсё большую вастрыню. Яна праходзіла ў спецыфічных умовах як у Беларусі, так і ва Украіне, аднак ёй былі ўласцівы агульныя формы і характар. Даследаванне і параўнанне гэтых працэсаў у гісторыі двух братэрскіх народаў з'яўляецца адной з актуальных праблем гістарыяграфіі. Наяўнасць значнай колькасці прац па дадзеным пытанні сведчыць не столькі аб дастатковай вывучанасці гэтай тэмы, а пра неабходнасць далейшых дыскусій і даследаванняў гісторыкаў Беларусі, Украіны, Расіі, Польшчы і іншых краін. Па сённяшні дзень маюць месца розныя меркаванні па адзначанай тэматыцы. Прац гісторыка-параўнальнага характару па гэтым перыядзе не існуе.

Пытанням узмацнення прыгонніцкага прыгнёту і антыфеадальнай барацьбы надаваў увагу Л.С. Абэцэдарскі [1]. Ён вызначае розныя формы антыфеадальнай барацьбы беларускага сялянства і лічыць, што ўзмацненне прыгонніцкага прыгнёту прывяло да масавых уцёкаў сялян Беларусі спачатку ва Украіну, а ў першай трэці XVII ст. – у Расію. Пры вызначэнні характару сялянскіх выступленняў навуковец адзначае, што «барацьба сялян супраць феадальнага прыгнёту мела асаблівасці, якія былі выкліканы ў кожным асобным выпадку пэўнымі гістарычнымі абставінамі» [2, с. 64]. Ён лічыць, што ўзброеныя выступленні сялян і нізоў гарадскога насельніцтва супраць феадальнага прыгнёту ў Беларусі сталі

прымаць масавы характар толькі з 90-х гг. XVI ст. У яго працы вызначаецца характар шэрага антыфеадальных выступленняў канца XVI – першай трэці XVII ст., якія прымалі рэлігійную афарбоўку ў сувязі з узмацненнем нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту [3, с. 82 –87].

Аналіз рэнтнай структуры сялянскага надзелу ў прыватнаўласніцкіх уладаннях Беларусі ў другой палове XVI – XVIII ст. даў В.Ф. Голубеў у кандыдацкай дысертацыі, прысвечанай землеўладанню і землекарыстанню сялян [4].

У 1975 г. з-пад пяра П.В. Міхайліна выйшла адна з першых манаграфій па гісторыі барацьбы гарадскога насельніцтва Украіны ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. [5], а ў 1987 г. – кніга А.П. Арцюшэўскага, прысвечаная сумеснай антыпрыгоннай барацьбе працоўных мас Расіі, Украіны і Беларусі ў другой палове XVI – 60-я гг. XVII ст. [6, с. 34 – 35]. У гістарыяграфіі канца XX – пачатку XXI ст. па-ранейшаму шмат увагі надаецца праблеме ўзмацнення прыгонніцкага прыгнёту і антыфеадальнай барацьбы ў Беларусі і Украіне ў другой палове XVI – першай трэці XVII ст. [7].

Падставай да аднаго з першых буйных паўстанняў сталі супярэчнасці паміж дробнамаёнткавай шляхтай і магнатамі. Апошнія спрабавалі павялічыць свае зямельныя ўладанні не толькі за кошт сялянскіх надзелаў, але і зямель шляхты. Паводле соймавай Канстытуцыі 1790 г. гетман рэестравага казацтва Крыштаф Касінскі атрымаў каралеўскую грамату на ўрочышча Ракітна [8], на якое стаў прэтэндаваць кіеўскі ваявода і сенатар князь Канстанцін Астрожскі.

Казацкае паўстанне пад кіраўніцтвам К. Касінскага пачалося 19 снежня 1591 г. з нападу атрада рэестравага і нізавога (запарожскага) казацтва на замак у Белай Царкве, якім валодаў стараста, сын Канстанціна Астрожскага, Януш [9].

Высунуты ў глыб стэпаў замак у Белай Царкве быў адным з важнейшых форпастоў Рэчы Паспалітай ва Усходняй Украіне. Ён дапамагаў феадалам і каралеўскай адміністрацыі трымаць у падпарадкаванні акаляючае насельніцтва, перашкаджаць уцёкам сялян і мяшчан у Запарожскую Сеч і заступаў дарогу татарам.

З часоў падаўлення ўзброенага выступлення белацаркоўскіх мяшчан прайшоў год, а становішча ў горадзе заставалася напружаным. Калі атрад К. Касінскага падышоў да Белай Царквы, мяшчане падтрымалі казакаў. Замак быў узяты. Паўстанцы захапілі артылерыю, боепрыпасы і розную маёмасць. У руках паўстанцаў апынуліся Трыполле і Пераяслаў (на левым беразе Дняпра) [10].

Паўстанцы спалілі архіў старосты, у якім захоўваліся афіцыйныя дакументы (у тым ліку універсалы на валоданне землямі ў Белацаркоўскім старостве) [11].

Узяцце Белай Царквы, Трыполля і Пераяслаўля ўскалыхнула мясцовае насельніцтва. Сяляне выганялі з маёнткаў уладальнікаў, дзялілі іх зямлю і маёмасць, узбройваліся і ўводзілі казацкія парадкі: на сельскіх радах выбіралі атаманаў, суддзяў і самі вырашалі ўсе найважныя мясцовыя справы. Асобныя атрады сялян далучаліся да паўстанцаў К. Касінскага. Акрамя таго, краўнік паўстання паспрабаваў мабілізаваць у свой атрад мясцовую дробную шляхту, якая таксама была незадаволена дзеяннямі князёў Канстанціна і Януша Астрожскіх. Аднак імкненне распаўсюдзіць паўстанне на ўсю Валынь і далей на захад не ўвянчалася поспехам [12].

Напалоханы размахам народнага руху Жыгімонт III ужо ў студзені 1592 г. прызначыў камісію для расследавання «самавольства і пакарання вінаватых». У склад камісіі ўвайшлі церабоўльскі староста Якаў Прэтвіч, чаркаскі – Аляксандр Вішнявецкі, брацлаўскі – Якаў Струсь, барскі – Станіслаў Гульскі і інш. Вярхоўным начальнікам рэестра быў прызначаны князь Язлавецкі, які на чале сваіх каманд і шляхецкіх атрадаў рушыў на Трыполле. Князь Язлавецкі вырашыў спачатку аддзяліць рэестравае казацтва К. Касінскага ад асноўнай масы паўстанцаў і толькі пасля гэтага пакончыць са «сваволлем». Спыніўшыся пад Фаставам, карнікі ад імя князя Язлавецкага паслалі ліст у Трыполле паўстанцам, у якім у пачцівай форме, называючы іх «панамі малайчынамі запарожскімі», прапаноўвалі выдаць К. Касінскага і скласці зброю, бо, маўляў, «…з-за аднаго лотра (разбойніка. – *У.К.*) вы не захочаце падвяргацца пакаранню». Інакш карнікі пагражалі крывавай расправай.

Кіраўнікі паўстанцаў прынялі ліст і пачалі перамовы, запэўніўшы камісараў, што К. Касінскі ўжо пазбаўлены гетманства, і яны гатовы падпарадкоўвацца каралеўскай уладзе. На гэтых умовах і была складзена дамова, пасля чаго шляхецкае войска караля пакінула пазіцыі пад Фаставам, а казакі раз'ехаліся па сваіх старостве [13].

Пасля сыходу шляхецкага войска паўстанне стала хутка шырыцца. У чэрвені 1592 г. паўстанцы, падтрыманыя мяшчанамі, прыступілі да аблогі Кіеўскага замка. Яны неаднаразова падступалі да горада і замка, захоплівалі гарматы, іншую зброю і порах.

На працягу другой паловы 1592 г. і зімы 1593 г. паўстанне распаўсюдзілася на Валынскае і Брацлаўскае ваяводствы. 11 студзеня 1593 г. шляхта Луцкага павета звярнулася за дапамогай да феадалаў суседніх паветаў, паведамляючы ім, што паўстанцы, якія ўварваліся ў Кіеўскае і Валынскае ваяводствы, захопліваюць каралеўскія і шляхецкія замкі і гарады. У рэзалюцыі ўладзімірскага сейміка гаварылася аб небяспецы, што пагражала феадалам ад

паўстанцаў, якія занялі «немало замков і сел украинных… брации нашай, шляхтичов оных краев». Паўстанцы, па іх звестках, «з немалым войском, з арматою, способом неприятельским, юж до Волынского воеводства пристегнули, умысливши, далей панства короля его милости пустошити» [14].

Народнае паўстанне прымала ўсё больш грозны характар. Аляксандр Вішнявецкі сцвярджаў, што паўстанцы імкнуліся «перавярнуць да падмурку ўсё пагранічча і нас (шляхту. – *У.К.*) усіх знішчыць» [15]. Сяляне не толькі захоплівалі маёнткі, але і распраўляліся з іх уладальнікамі, уводзячы казацкія парадкі ў захопленых паўстаннем мясцовасцях. Шляхта Валынскага ваяводства, памкнуўшыся на «роки земские и рочки кгродские», скардзілася на «людей своевольных», казакаў, якія «до присег на послушенство свое примушають» [16] мясцовае насельніцтва, г. зн. усталёўваюць сваю ўладу.

На вераснёвым сойме 1592 г. украінскія магнаты на чале з князем К. Астрожскім патрабавалі неадкладна адправіць на падаўленне паўстання кароннае войска. Магнатаў падтрымлівалі ўсе дэпутаты Украіны, аднак супраць такой прапановы былі дэпутаты цэнтральных польскіх правінцый, шляхта якіх баялася застацца без ваеннай падтрымкі ў перыяд абвастрэння антыфеадальнай барацьбы. Падтрымліваючы каралеўскую ўладу ў яе палітыцы ўтаймавання магнатаў, шляхта не спяшалася ратаваць іх. Кароль, як прадстаўнік усяго класа феадалаў, імкнуўся ўсё ж хутчэй пакончыць з паўстаннем, якое пагражала і яго ўладзе. З дапамогай невялікіх саступак на карысць рэестраўцаў ён імкнуўся адлучыць іх ад сялян, гараджан і нерэестравага казацтва і вырашыць адразу ж дзве задачы – паслабіць пазіцыі ўкраінскіх і беларускіх магнатаў, а таксама знізіць накал і арганізаванасць антыфеадальнай барацьбы. Пад ціскам шляхты сойм адхіліў патрабаванне магнатаў аб адпраўцы ва Украіну кароннага войска. Адхілена была і прапанова магнатаў распусціць рэестр і канфіскаваць казацкія землі [17].

У верасні 1592 г. звярнуўся да караля Рэчы Паспалітай і К. Касінскі, які ў лісце ўпершыню спрабаваў абгрунтаваць ідэю непадпарадкаванасці рэестравага казацтва старостам і ваяводам. Па меркаванні даследчыкаў, гэта магло сведчыць аб зараджэнні сярод казацтва намераў «до розведення шляхти й короля по різних ціннісних нішах» [18]. Таму не выпадкова казакі актыўна ўзяліся за правядзенне на падкантрольных ім тэрыторыях свой «присуд», прымушалі насельніцтва (у тым ліку і шляхту) да прыняцця прысягі і паслухмянства на карысць Запарожскага войска, што азначала ні што іншае, як утварэнне альтэрнатыўных уладных структур [19].

Гэта прымусіла Жыгімонта III і канцлера Яна Замойскага выдаць універсал, які абавязваў шляхту Кіеўскага, Валынскага і Брацлаўскага ваяводстваў памкнуцца ў «посполитое рушение» і пад камандаваннем князя К. Астрожскага адправіцца на падаўленне паўстання. Аднак гэта была пустая фармальнасць, бо шляхта названых ваяводстваў і так знаходзілася ў поўнай залежнасці ад мясцовых магнатаў, якія маглі і без каралеўскага універсала ў любы час склікаць яе для ўдзелу ў барацьбе з паўстанцамі.

К. Астрожскі прызначыў зборным пунктам свайго войска г. Канстанцінаў. Тут сабраліся атрады шляхты і надворныя каманды магнатаў Вішнявецкага, Прэтвіча, Гульскага і інш. Януш Астрожскі збіраў шляхту ў Галічыне і вербаваў жаўнераў у Вугоршчыне. Войска К. Астрожскага складалася з шляхецкай конніцы і наёмнай нямецкай пяхоты. Яно было добра ўзброена і забяспечана ўсім неабходным для вядзення вайсковых дзеянняў [20].

Дрэнна ўзброеныя і непадрыхтаваныя паўстанцы, у большасці сваёй незнаёмыя з вайсковай справай сяляне, моцныя маразы і недахоп харчавання, сыход шматлікіх з іх па сваіх хатах і ціск пераўзыходзячых сіл магнацкіх войскаў вымусілі К. Касінскага адступіць пад мястэчка Пятка каля г. Чуднава на Жытоміршчыне, дзе і адбылася вырашальная бітва, якая працягвалася цэлы тыдзень. Паўстанцы, нягледзячы на вялікія страты, трымаліся стойка, і К. Астрожскі вымушаны быў пайсці на перамовы з паўстанцамі. 31 студзеня 1593 г. К. Астрожскі і К. Касінскі з вайсковым пісарчуком падпісалі дамову, па якой рэестраўцы павінны былі пазбавіць К. Касінскага гетманскай булавы, трымаць сталы гарнізон на Запарожжы, вярнуць захопленую зброю, землі і не прычыняць ніякай шкоды магнацкім і шляхецкім уладанням. Акрамя таго, неабходна было выключыць з казацкага войска ўсіх, хто ўступіў у яго падчас паўстання [21].

Пры падпісанні дамовы шляхта і магнаты разумелі, што ім не хапае сіл знішчыць паўстанцаў, таму былі вымушаны, патрабуючы адстаўкі з пасады гетмана К. Касінскага, падпісаць з ім прымірэнне. Паўстанцы пайшлі на пагадненне ў сілу вельмі цяжкіх умоў, у якія яны патрапілі, спадзеючыся сыйсці на Запарожжа і там падрыхтавацца да новага выступлення.

Прыбыўшы на Запарожжа, К. Касінскі звярнуўся за дапамогай да Расіі. Рускі ўрад не мог цалкам пайсці насустрач казакам – краіна яшчэ не акрыяла ад нягод Лівонскай вайны, а на поўначы ішла вайна са Швецыяй. Але ўсё ж Масква паслала ў Запарожскую Сеч сукно і грошы. Ад цара Фёдара Іванавіча была адпраўленая грамата, у якой гетману Крыштофу Касінскаму і іншым атаманам украінскіх казакоў прапаноўвалася разам з данскімі казакамі ваяваць супраць татараў [22].

У грамаце рускага цара данскім казакам ад 20 сакавіка 1593 г. сказана, што Фёдар Іва-

навіч загадаў «черкасом запорожским гетману Хриштопу Косицкому и всем атаманом и черкасом быть на Донце на шляхех и за царем итти (пераследваць татарскага хана. – *У.К.*)». Адначасова цар загадаў і данскім казакам: «…и вы б промышляли с ними (украінскімі казакамі. – *У.К.*) … сопча заодин» [23].

Спалохаўшыся таго, што рускі ўрад акажа дапамогу паўстанцам, чаркаскі староста Аляксандр Вішнявецкі 13 мая 1593 г. звярнуўся з лістом да канцлера Рэчы Паспалітай Яна Замойскага, у якім паведамляў, што К. Касінскі прысягнуў вялікаму князю маскоўскаму са ўсім сваім войскам і падпарадкаваў яму ўсё пагранічча (больш за 100 міль), а Фёдар Іванавіч у сваім пасланні запарожскім казакам зваў сябе ўжо «царем Запорозьким, Черкаським і Низовським і послал їм за пороги сукна и грошей» [24].

Улетку 1593 г. двухтысячнае паўстанцкае войска К. Касінскага накіравалася ўверх па Дняпры. Адзін атрад перасоўваўся па беразе, а другі плыў на лодках. Неўзабаве падступілі да Чаркасаў і акружылі замак. Аляксандр Вішнявецкі са сваёй камандай і навакольнай шляхтай апынуўся ў аблозе. Паўстанцаў зноў падтрымалі сяляне і мяшчане. А Вішнявецкі прапанаваў К. Касінскаму ўступіць у перамовы. К. Касінскі пагадзіўся і ў суправаджэнні атрада са 150 казакоў прыбыў у Чаркасы. Тут падчас перамоў ён быў здрадліва забіты. Польскі храніст Іахім Бельскі (сын Марціна Бельскага) пісаў, што К. Касінскага забілі «слугі князя Аляксандра Вішнявецкага», а паводле народных паданняў, шляхта, схапіўшы К. Касінскага, замуравала яго ў слуп у адным з каталіцкіх манастыроў [25].

Казакі яшчэ доўга стаялі пад Чаркасамі, аднак смерць кіраўніка паўстання прывяла да разброду, і рэестравае казацтва ў жніўні 1593 г. вымушана было пайсці на перамовы з А. Вішнявецкім. Па дамове рэестравым казакам падавалася права вольнага выхаду на Запарожжа і адтуль «на валасць» (тэрыторыю Рэчы Паспалітай. – *У.К.*). А. Вішнявецкі абавязваўся вярнуць казакам аднятыя ў іх лодкі, коней і іншую маёмасць. Пакінутая пасля смерці казакоў маёмасць павінна была паступаць на карысць іх сваякоў, а не старост, як было раней. Казакі атрымлівалі права скардзіцца кіеўскаму ваяводзе на ўціск з боку старосцінскай адміністрацыі [26]. Аднак пры першай жа спробе выкарыстаць гэта права кіеўскі ваявода К. Астрожскі схапіў казацкіх пасланцаў, якія жадалі падаць скаргу на чаркаскага старосту А. Вішнявецкага, кінуў іх у турму, катаваў, ад чаго адзін з пасланцаў памёр. Магнаты і шляхта не збіраліся выконваць умовы дамовы, якая была заключана ў жніўні 1593 г. Так, напрыклад, кіеўскі біскуп Юзэф Верашчынскі ў лісце ад 19 жніўня 1593 г. канцлеру Яну Замойскаму пісаў: «Дамова з імі было вымушана абставінамі… Лепш, вядома, каб іх (казакоў. – *У.К.*) зусім не было ва Украіне, але зараз не час гаварыць аб гэтым, да таго ж і сіл для гэтага няма» [27].

У адказ на ўзмацненне феадальнага прыгнёту восенню 1593 г. Падняпроўе зноў ахапіла полымя новага паўстання. Войска паўстанцаў зрушылася на Кіеў. Па дарозе да паўстанцаў далучаліся сяляне і мяшчане. 4 кастрычніка 1593 г. той жа кіеўскі біскуп Ю. Верашчынскі паведамляў, што ў паходзе на Кіеў прымала ўдзел каля 4 тыс. казакоў войска Запарожскага [28].

Атрымаўшы вестку аб набліжэнні да Кіева паўстанцаў, шляхта адправіла ім насустрач сваіх дэпутатаў – біскупа Ю. Верашчынскага і князя К. Ружынскага, аднак паўстанцы адхілілі прапанову аб перамовах і працягвалі паход на Кіеў. Шляхта збегла з горада, і паўстанцы асадзілі Кіеў. Узяццю Кіева перашкодзіла вестка аб нападзе на Запарожжа татараў. Хутчэй за ўсё, што польскія дыпламаты ўгаварылі хана на гэты крок. Невялікі казацкі гарнізон, нягледзячы на мужнае супраціўленне, вымушаны быў адступіць і пакінуць Сеч, сыходзячы на лодках уверх па Дняпры. Татары знішчылі ўсе ўмацаванні. Паўстанцы адышлі ад Кіева і накіраваліся ў нізоўі Дняпра. Аднак паўстанне ў Падняпроўе і на Брацлаўшчыне працягвалася. Засярodзіўшы ўсе сілы, урад Рэчы Паспалітай, мясцовая шляхта і магнаты здолелі задушыць народнае паўстанне пад кіраўніцтвам К. Касінскага, але гэтая перамога была вельмі кароткачасовай.

*Літаратура і крыніцы*


1. *Абецедарский, Л.С.* Белоруссия и Россия: Очерки русско-белорусских связей второй половины XVI–XVII в. / Л.С. Абецедарский. – Минск: Вышэйш. шк., 1978. – 255 с.
2. *Там жа.*
3. *Там жа.*
4. *Голубев, В.Ф.* Землеведение и землепользование крестьян Белоруссии во второй половине XVI – XVIII в.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / В.Ф. Голубев. – Минск, 1987. – 19 с.
5. *Михайлина, П.В.* Визвольна боротьба трудового населення міст України (1569–1654) / П.В. Михайлина. – Київ: Наук. думка, 1975. – С.42.
6. *Артюшевский, О.П.* Совместная антикрепостническая борьба трудящихся масс России, Украины и Белоруссии. Вторая половина XVI – 60-е годы XVII ст. / О.П. Артюшевский. – Киев: Вища школа, 1987. – 155 с.
7. Сучасныя праблемы гістарыяграфіі: матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 28 лістап. 2003 г. У 3 ч. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал.: А.М. Люты (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2003. – Ч. 1. – 252 с.
8. Історія українського козацтва: нариси: у 2 т. – Київ: Києво-Могилянська академія, 2006. – Т. 1. – С. 88.
9. *Плохій, Сергій.* Наливайкова віра: Козацтво та релігія в ранньомодерній Україні / Сергій Плохій. – Київ, 2005. – С. 53.
10. *Грушевський, Михайло.* Історія України–Руси / Михайло Грушевський. – Київ, 1995. – Т. 7: Козацькі часи – до року 1625. – С. 180–182; Жерела до історії України–Руси. В 22 т. / гол. ред.: М. Грушевский. – Львів: Б.И., 1908. – Т. 8. – Док. 3, 43, 48.
11. Архив ЮЗР. – Т. 1, ч. 3. – Док. № 12. – С. 31–32.
12. *Gordon, Linda.* Cossack Rebellions: Social Turmoil in the Sixteenth – Century Ukraine / Linda Gordon. – Albany, N.Y., 1983. – P. 116.

13. История Украинской ССР: в 10 т. / гл. ред.: Ю.Ю. Кондифор. – Киев: Наукова думка, 1982. – Т. 2. – С. 353–354.
14. Архив ЮЗР. – Т. 1, ч. 3. – С. 49–50; Док. 14. – С. 36–37.
15. История Украинской ССР. В 10 т. / гл. ред.: Ю.Ю. Кондифор. – Киев: Наукова думка, 1982. – Т. 2. – С. 355.
16. Архив ЮЗР. – Т. 1, ч. 3. – С. 39.
17. *Леп'явко, С.А.* Повстання К. Касінскага (1591–1593 рр.) / С. Леп'явко // Український историчний журнал. – 1994. – № 4.– С. 120–132.
18. *Брехуненко, В.* Дванадцять листів гетьманів Війська Запорозького XVI – першої половини XVII століття з польських рукописних зібрань / В. Брехуненко, М. Нагельский // Український археографічний щорічник. – Київ; Нью-Йорк, 2004. – Вип. 8/9. – Т. 11/12. – С. 440.
19. *Там жа.* – С. 425.
20. *Леп'явко, С.* Козацькі війни кінця XVI ст. в Україні / С. Леп'явко. – Чернігів, 1996. – С. 71–72, 79.
21. *Леп'явко, С.А.* Повстання К. Касінскага (1591–1593 рр.) / С. Леп'явко // Український историчний журнал. – 1994. – № 4.– С. 128–129.
22. *Леп'явко, С.* Козацькі війни кінця XVI ст. в Україні / С. Леп'явко. – Чернігів, 1996. – С. 81–83.
23. История СССР. В 2 т. / под ред. А.Л. Сидорова. – М.: Мысль, 1966. – Т. II. – С. 445.
24. Історія України в документах і матеріалах / від. ред.: С.М. Білоусов. – Київ: Вид-во Акад. наук УРСР, 1941. – Т. 3. – С. 25.
25. Історія українського козацтва: нариси. У 2 т. – Київ: Києво-Могилянська академія, 2006. – Т. 1. – С. 544.
26. История Украинской ССР. В 10 т. / гл. ред.: Ю.Ю. Кондифор. – Киев: Наукова думка, 1982. – Т. 2. – С. 357.
27. Listy Stanislawa Zolkiewskiego (1584–1620). – Krak w, 1868. – S. 27; Kronika M. Bielskiego. – T. 3. – S. 1690–1691.
28. История Украинской ССР. В 10 т. / гл. ред.: Ю.Ю. Кондифор. – Киев: Наукова думка, 1982. – Т. 2. – С. 357.

SUMMARY

*In his work the author focuses on a problem of increasing of social and economic oppression of Belarusian and Ukrainian people and antifeudal struggle in the second half of the 16th – the 30th of the 17th centuries and various estimations of this problem.*

*The analysis of the publication of early texts of antifeudal struggle in the second half of the 16th – first thirds of the 17th centuries is made by the author in a convincing, full and objective way.*

Паступіў у рэдакцыю 30.04.2010 г.

*УДК 303.446:94(47).072.5*

***І.А. Груцо,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ*

# СІМВАЛЫ ВОІНСКАЙ ДОБЛЕСЦІ ФРАНЦУЗСКАГА ВОЙСКА Ў ВАЕННАЙ КАМПАНІІ 1812 г. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАЙ РАСІЙСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ)

Да нашага часу асобныя аспекты франка-рускай вайны 1812 г. з'яўляюцца спрэчнымі і недастаткова даследаванымі. У дадзеным артыкуле мы звернем увагу на лёс палкавых знакаў воінскага доблесці французскага войска падчас адступлення з Масквы. У напалеонаўскай імперыі яны мелі афіцыйную назву «Арлы». Гісторыя Арлоў як дзяржаўнага геральдычнага знака бярэ свой пачатак з мая 1804 г., неўзабаве пасля абвяшчэння Напалеона імператарам [1, с. 1]. За ўзор была ўзята скульптурная выява арла часоў Рымскай імперыі, роўна як і практыка яго выкарыстання ў войсках. У тым жа 1804 г. Арлы былі ўрачыста ўручаныя кожнаму батальёну ў пяхотных і кожнаму эскадрону ў кавалерыйскіх палках французскага войска, а пасля чаго «Арол, і толькі Арол з'яўляўся прадметам салдацкай адданасці» [1, с. 12].

Па сваёй канструкцыі Арол уяўляў сабой сукупнасць трох элементаў: пазалочанае бронзавае навершша ў форме арла, шаўковае палотнішча сцяга і дрэўка. Два апошнія элементы мелі другараднае значэнне, паколькі не з'яўляліся знакамі напалеонаўскай імперыі. Яны выконвалі функцыю пазначэння воінскага падраздзялення на полі бою і іх страта, у адрозненне ад навершша-арла, не наклікала для яго ганьбы.

25 снежня 1811 г. Напалеон падпісаў дэкрэт, заклікаными ўзмацніць значэнне Арлоў як знакаў імперыі і воінскай доблесці. З гэтага часу ўводзіліся новыя палотнішчы сцягоў, якія адрозніваліся ад папярэдніх багаццем залатога шыцця і абавязковым малюнкам нумара палка з пералікам пераможных бітваў, у якіх ён прымаў удзел, а таксама геральдычных знакаў імперыі: кароны, лацінскай літары N і арла [2, с. 26]. Навершша-арол засталося мадэлі 1804 г. і ў войсках, паводле традыцыі, якая ўжо склалася, па-ранейшаму лічылася галоўным элементам Арла. Іх колькасць яшчэ ў лістападзе 1811 г. была скарочана да аднаго на полк, а ўсе астатнія падлягалі здачы на захаванне.

Падчас ваеннай кампаніі 1812 г. французскія палкі Вялікага войска страцілі частку сваіх Арлоў. Лічылася, што «варожыя сцягі з'яўляюцца найгалоўнейшым набыткам славы нашых (расійскіх. – *І.Г.*) воінаў» [3, с. XI], таму гэты факт не мог быць праігнараваны прадстаўнікамі дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі.

У 1813 г. палкоўнік рускага войска П.А. Чуйкевіч, кіраўнік Асобай канцылярыі – вышэйшага органа расійскай ваеннай разведкі, апублікаваў працу «Разважанні аб вайне 1812 года» [4]. У ёй упершыню была абагульненая разнастайная інфармацыя аб трафеях мінулай кампаніі.